ШКОЛЬНАЯ ПРАГРАМА

**Л. Э. Сенкевіч, М. К. Грыцэнка, Н. А. Дабравольская**

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

## 2 клас

***Рознаўзроўневыя тэсты з правіламі і заданнямі***

Дапаможнік для вучняў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання

Мінск
«Сэр-Віт»
2021

# Ад аўтараў

***Шаноўны другакласнік!***

Дапаможнік, які ты трымаеш у руках, створаны з мэтай спрыяць твайму далейшаму поспеху ў пазнанні і вывучэнні роднай мовы, мовы тваіх бацькоў, дзядоў, прадзедаў, спрыяць выпрацоўцы трывалых навыкаў граматнага пісьма, пашырэнню слоўнікавага запасу.

У дапаможніку прапануюцца практыкаванні і розныя заданні для адпрацоўкі арфаграфічных навыкаў, шмат матэрыялу для развіцця маўлення і пашырэння лексічнага запасу вучняў.

На пачатку кожнай тэмы прапануецца ўспомніць правілы, а потым папрактыкавацца ў іх прымяненні: растлумачыць правапіс, уставіць прапушчаныя літары, знайсці памылкі. Каб праверыць трываласць набытых ведаў, выконвай рознаўзроўневыя заданні ў прапанаваных тэстах.

Рэгулярна працуючы ў сшытку, ты зможаш правільна гаварыць па-беларуску, чым парадуеш настаўніка і сваіх бацькоў. Ты зразумееш, што родная мова прыгожая і мілагучная.

***Карыснай і цікавай працы табе на старонках дапаможніка!***

Настаўнік можа выкарыстоўваць дапаможнік не толькі на ўроках беларускай мовы, але і для правядзення розных заняткаў, на інтэграваных уроках пісьма і чытання.

Бацькі могуць выкарыстаць дапаможнік для праверкі і замацавання ведаў сваіх дзяцей, а таксама для ліквідацыі прабелаў у іх ведах.

# УСТУПНЫ КУРС

## Вывучаем беларускую мову

***Памятка!*** У беларускай мове гук [і] абазначаецца галоснай літарай ***і***, якая адрозніваецца ад такой жа літары ў рускай мове: ***І і.***

### *Папрактыкуйся.*

**1.** Прачытай тэкст. Падкрэслі літару ***і***.

Ігнатка скончыў першы клас. Гэта былі яго першыя канікулы, калі ўсё лета вольнае.

*С. Далідовіч.*

**2.** Літара згубілася. Устаў ***І*** або ***і***.

Дзед ..гнат люб..ў восеньск..м ранкам зайсц.. ў сад. Ён з ахвотаю паказваў ..рынцы чырвоныя яблык.., жоўтыя грушы.

***Памятка!*** Апостраф не літара, а надрадковы знак. Там, дзе ў слове стаіць апостраф, пры чытанні вымаўляецца гук [**й'**]. Апостраф раздзяляе **цвёрдыя зычныя і галосныя *е*, *ё*, *ю*, *я*, *і*.**

**3.** Прачытай. Вучыся правільна вымаўляць словы з апострафам.

Вераб’іны, кап’ё, п’е, сур’ёзны, пад’ёмны, з’еў, з’явіўся, з’ехаў.

**4.** Выпішы словы з апострафам.

Сяўба, сям’я, пад’ём, пойдзем, вераб’і, салаўіны, б’е, бег.

***Памятка!*** Гукі [**г**], [**г’**] у беларускай і рускай мовах вымаўляюцца па-рознаму, але на пісьме абазначаюцца адной і той жа літарай.

**5.** Прачытай, правільна вымаўляючы гук [**г**].

**Г**ром над борам у**г**ары
**Г**рукнуў **г**розна ў тры вядры.
Аж да вечара ў бары
**Г**рукацелі тры вядры.

*А. Зэкаў.*

***Памятка!*** У беларускай мове гук [**ч**] вымаўляецца цвёрда: *пачатак, чароўны,чытанка*.
Гаварыце правільна: [*шч*] – [*шч*]*асце*, [*шч*]*ыры*, *бор*[*шч*].

**6.** Прачытай, падкрэслі літару ***ч***.

Аднойчы ўбачыў зайчык, як пад кустом вожык плача. Слёзы кацяцца ў беднага з вачэй. Зайчык пытаецца:

– Сябра вожык, чаго ты плачаш? Глянь, як сонейка свеціць (*Паводле Я. Галубовіча*).

***Памятка!*** Гук [**ў**] абазначаецца літарай ***ў*** (**у нескладовае**): *чытаў, пісаў, лоўка, воўк*. Такой літары няма ў рускім алфавіце.

**7.** Прачытай, падкрэслі літару ***ў***. Правільна вымаўляй словы.

Колькі тут сягоння бедаў:
Воўк упаў з веласіпеда!
Разагнаўся і, на жаль,
Паламаў у ім педаль.

*Р. Баравікова.*

## ***Правер сябе!***

### Тэст

**1.** Выберы і адзнач «✓» радок, у якім словы запісаны па-беларуску.

☐ Алина, линия, качели, осенний;
☐ знік, відаць, Алінка, жывоцік, коцік.

**2.** Які гук вымаўляецца там, дзе стаіць апостраф? Адзнач «✓».

☐ [ў]; ☐ [і]; ☐ [й’]; ☐ [ы].

**3.** Які гук у беларускай мове вымаўляецца не так, як у рускай? Адзнач «✓».

☐ [в]; ☐ [к]; ☐ [г]; ☐ [б].

**4.** Адзнач радок «✓», у якім усе выдзеленыя літары абазначаюць цвёрдыя гукі.

☐ Ві**д**элец, **ч**арот, **к**аток, **л**ясок;
☐ пле**ч**ы, хут**ч**эй, да**ч**ушка, ката**ч**ка;
☐ **ч**ырвоны, **ч**апля, **ц**іхі, бабу**л**я.

**5.** Запішы тры словы з літарай ***ў***.

______________________________________________

______________________________________________

## Гукі і літары

***Памятка!*** У беларускай мове ёсць мяккі гук [**ц’**]. На пісьме ён абазначаецца літарамі ***ц Ц***.

### *Папрактыкуйся.*

**1.** Прачытай верш. Падкрэслі словы, у якіх вымаўляецца гук [**ц’**].

Люлі, люлі, люлі.
Дзеткі ўсе паснулі.
Не спіць толькі коця,
Ходзіць па балоце.
Застудзіў ён лапку,
Прыйшоў грэцца ў хатку.

*В. Вітка.*

***Памятка!*** У беларускай мове гук [**р**] вымаўляецца толькі цвёрда:
*ба**р**абан, **р**адок, папе**р**а, **р**эчка, г**р**эчка*.

**2.** Выпішы з прыказкі словы з літарай ***р***.

Хлеб у доме – гаспадар, на працы – сябар, у дарозе – таварыш.

✶ Як ты разумееш прыказку?

***Памятка!*** У беларускай мове гук [**дз’**] абазначаецца дзвюма літарамі **д** і **з** (спалучэннем **дз**). Ён заўсёды мяккі.

**3.** Прачытай словы. Правільна вымаўляй гукі [**р**], [**дз’**], [**ч**]. Падкрэслі словы, у якіх чуецца гук [**дз’**].

**Р**ашу**ч**ы, **Р**а**дз**іма, **ч**ароўны, **дз**іцятка, **дз**яцел, **ч**арот, **дз**якаваць.

**4.** Прачытай сказы. Выпішы словы, у якіх вымаўляецца гук [**дз’**].

У трамвай праз пярэднія дзверы ўваходзіў старэнькі дзядок... Хлопчык усхапіўся з лаўкі, падаў руку. Дзядуля падзякаваў яму (*Паводле А. Пальчэўскага*).

***Памятка!*** У беларускай мове гук [**дж**] абазначаецца дзвюма літарамі ***д*** і ***ж***.
Гук [**дж**] заўсёды вымаўляецца цвёрда.

**5.** Адшукай словы з гукам [**дж**]. Выпішы іх.

Пчала – вельмі цікавае насякомае. У яе ёсць добры памочнік – джала.

Але джаліць яна толькі тады, калі адчувае небяспеку. Жывуць пчолы ў вуллях. Туды яны носяць нектар. Там і хаваюцца ад дажджу.

**6.** Выпішы словы з гукамі [**дз'**] і [**дж**] у два слупкі.

Прастудзіўся, цяпер, сняжынкі, ураджай, пасажыры, дзень, агароджа, шчупак, дзівак, вожык, дажджы, дружба.

**[дз']** **[дж]**

## *Правер сябе!*

### Тэст

1. Выберы і адзнач «✓» словы, у якіх ёсць гукі, што абазначаюцца дзвюма літарамі.

☐ Бацька; ☐ дзіцятка; ☐ роўны.
☐ джала; ☐ дзякуй;

2. Якіх гукаў няма ў рускай мове? Адзнач «✓».

☐ [дж]; ☐ [н’]; ☐ [дз’]; ☐ [ў]; ☐ [к].

3. Колькі ў сказе слоў з гукам [**р**]? Адзнач «✓».

...У ступе ўперамешку цукар і арэшкі, разынкі й цукеркі ў залатой паперцы (*У. Караткевіч*).

☐ [3]; ☐ [5]; ☐ [6]; ☐ [4].

4. У якім слове напісанне і вымаўленне не супадае? Адзнач «✓».

☐ Футра; ☐ гром; ☐ агарод; ☐ дрэва.

5. Адзнач словы, у якіх чуецца зычны гук [**дж**].

☐ Джала; ☐ будаўнік; ☐ хаджу;
☐ садоўнік; ☐ дрожджы; ☐ саджанец.

# ЗМЕСТ


АД АЎТАРАЎ . . . 3
УСТУПНЫ КУРС . . . 4
Вывучаем беларускую мову . . . 4
Гукі і літары . . . 8
ГУКІ МОВЫ . . . 12
Абазначэнне гукаў на пісьме літарамі . . . 12
Беларускі алфавіт . . . 15
Напісанне вялікай літары ў словах . . . 18
Галосныя і зычныя гукі . . . 23
Вымаўленне і правапіс слоў з ***ў*** . . . 26
Склад. Падзел слоў на склады. Перанос слоў . . . 30
Націск . . . 33
Галосныя гукі [о], [э] – [а]. Правапіс слоў з літарамі ***о***, ***э*** – ***а*** . . . 36
Правапіс слоў з літарамі ***е***, ***ё*** – ***я*** . . . 39
Цвёрдыя і мяккія зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме . . . 42
Зычныя гукі [д] – [дз’]. Іх абазначэнне на пісьме . . . 45
Зычныя гукі [т] – [ц’]. Іх абазначэнне на пісьме . . . 48
Зацвярдзелыя зычныя гукі. Правапіс слоў з імі . . . 51
Парныя звонкія і глухія зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме . . . 54
Падоўжаныя зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме . . . 58
Раздзяляльныя знакі – апостраф (**’**) і мяккі знак (***ь***) . . . 61
СЛОВА . . . 66
Значэнне слова . . . 66
Словы, якія называюць прадметы . . . 68
Прыназоўнік. Правапіс прыназоўнікаў . . . 71
Словы, якія называюць прыметы прадметаў . . . 74
Словы, якія называюць дзеянні прадметаў . . . 78
Сказ. Афармленне сказа на пісьме . . . 81
ТЭКСТ . . . 85
ПАЎТАРЭННЕ . . . 89
СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ . . . 93